**ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

**ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

**Р А Ш Э Н Н Е**

**Р Е Ш Е Н И Е**

30 чэрвеня 2023 г. № 332

г. Гродна

г. Гродно

Аб парадку правядзення абласнога літаратурнага конкурсу імя М.Багдановіча

На падставе падпункта 4.1 пункта 4 артыкула 210 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, пункта 1 артыкула 40 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 108-З «О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь» Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЎ:

1. Заснаваць абласны літаратурны конкурс імя М.Багдановіча.
2. Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку правядзення абласнога літаратурнага конкурсу імя М.Багдановіча (дадаецца).
3. Абнародаваць (апублікаваць) дадзенае рашэнне ў газеце «Гродзенская праўда».
4. Дадзенае рашэнне ўступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Старшыня У.С.Каранік

Кіраўнік спраў І.І.Курман

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне Гродзенскага
абласнога выканаўчага
камітэта
30.06.2023 № 332

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку правядзення
абласнога літаратурнага
конкурсу імя М.Багдановіча

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак правядзення абласнога літаратурнага конкурсу імя М.Багдановіча (далей, калі не пазначана іншае, – конкурс).

2. Арганізатарам конкурсу з’яўляецца Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт (далей – аблвыканкам).

3. Мэты правядзення конкурсу:

папулярызацыя дзейнасці пісьменнікаў Гродзенскай вобласці;

стымуляванне стварэння высокамастацкіх літаратурных твораў;

выяўленне таленавітых аўтараў і новых імёнаў у літаратуры;

павышэнне статусу пісьменніка ў грамадстве.

4. Конкурс праводзіцца адзін раз у два гады па сямі намінацыях:

“Паэзія”;

“Проза”;

“Дзіцячая літаратура”;

“Публіцыстыка і краязнаўства”;

“Літаратуразнаўства і крытыка”;

“Драматургія”;

“Адкрыццё года”.

5. На конкурс дапускаюцца неапублікаваныя раней літаратурныя творы на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь. Размяшчэнне літаратурных твораў або іх фрагментаў у сацыяльных сетках і глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт (далей – сетка Інтэрнэт) прыраўноўваецца да публікацыі.

6. Удзельнікам конкурсу з’яўляецца аўтар літаратурнага твора, які на дату падачы заяўкі на ўдзел у конкурсе дасягнуў 18-гадовага ўзросту і зарэгістраваны (фактычна пражывае) на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

7. Дапускаецца ўдзел у конкурсе аднаго аўтара ці некалькіх аўтараў у некалькіх намінацыях з рознымі творамі.

8. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі намінаваных літаратурных твораў з'яўляюцца:

літаратурна-мастацкі ўзровень літаратурнага твора;

актуальнасць тэмы літаратурнага твора;

наяўнасць сучасных літаратурных падыходаў да распрацоўкі тэмы;

абгрунтаванне агульначалавечых каштоўнасцяў і ідэй гуманізму;

выкарыстанне ў літаратурным творы рэгіянальнага фактара (асаблівасці мясцовага каларыту).

9. На конкурс не дапускаюцца творы, якія папулярызуюць (прапагандуюць), у тым ліку ўскосна, гвалт, агрэсіўныя паводзіны, распальванне нацыянальнай і рэлігійнай варожасці, ужыванне алкаголю і наркотыкаў, крымінальны і амаральны лад жыцця, з выкарыстаннем ненарматыўнай лексікі.

10. Намінацыя разглядаецца, калі ў ёй не менш за 5 удзельнікаў.

11. У кожнай намінацыі вызначаецца адзін пераможца.

12. Пераможцамі конкурсу могуць быць як адзін аўтар, так і калектыў аўтараў.

Пераможца ў намінацыі можа не вызначацца ў сувязі з адсутнасцю высокамастацкіх твораў.

Дапускаецца вызначэнне аднаго аўтара (калектыва аўтараў), які прадставіў некалькі твораў у розных намінацыях, пераможцам па некалькіх намінацыях.

13. Вызначэнне намінацыі конкурсу, у якой прымаецца ўдзел, ажыццяўляецца аўтарамі літаратурных твораў.

Пры вылучэнні твораў у намінацыі "Адкрыццё года" члены Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі" удзелу не прымаюць.

14. Аб'ява аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў сродках масавай інфармацыі і сетцы Інтэрнэт не пазней за 1 снежня года, папярэдняга году правядзення конкурсу.

15. Для ўдзелу ў конкурсе ўдзельнікам неабходна да 1 лютага года правядзення конкурсу прадставіць ва ўпраўленне культуры аблвыканкама:

заяўку на ўдзел у абласным літаратурным конкурсе імя М.Багдановіча па форме згодна з дадаткам;

кароткія біяграфічныя звесткі аб удзельніку конкурсу;

экзэмпляр літаратурнага твора ў выглядзе рукапісу (у друкаваным і электронным выглядзе): шрыфт 14 Times New Roman, фармат ліста А4.

Аб'ём твора, які прадстаўляецца на конкурс, павінен змяшчаць не менш за 60 старонак (за выключэннем намінацыі "Дзіцячая літаратура").

Імя аўтара літаратурнага твора ўказваецца толькі ў заяўцы на ўдзел у абласным літаратурным конкурсе імя М.Багдановіча. У тэксце (літаратурным творы) імя аўтара не павінна прысутнічаць для гарантыі ананімнасці пры разглядзе членамі камісіі.

16. Для вызначэння пераможцаў конкурсу ствараецца камісія ў колькасці не менш за 9 чалавек, персанальны склад і рэгламент работы якой зацвярджаецца старшынёй аблвыканкама.

17. Камісія ажыццяўляе:

разгляд матэрыялаў, якія паступілі на конкурс;

ацэнку літаратурных твораў згодна з крытэрыямі, вызначанымі у пункце 8 дадзенай Інструкцыі;

вызначэнне пераможцаў конкурсу па кожнай намінацыі.

Рэцэнзіі на літаратурныя творы камісіяй не выдаюцца.

18. Пераможцу конкурсу ў кожнай намінацыі ўручаецца дыплом у рамцы, букет кветак і грашовая ўзнагарода ў памеры 100 базавых велічынь.

У выпадку, калі пераможцам у намінацыі становіцца калектыў аўтараў, дыплом у рамцы і букет кветак уручаецца кожнаму з аўтараў, а грашовая ўзнагарода ў памеры 100 базавых велічынь выдзяляецца ім сумесна.

Дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” прымае ў абменны фонд 40 працэнтаў тыражу ад выдання літаратурнага твора аўтара (калектыва аўтараў), вызначанага пераможцам конкурсу, для далейшага размеркавання паміж публічнымі бібліятэкамі Гродзенскай вобласці.

Літаратурныя творы пераможцаў конкурсу ў электронным фармаце захоўваюцца на працягу 5 гадоў у дзяржаўнай установе культуры “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

19. Узнагароджанне пераможцаў конкурсу ажыццяўляецца ва ўрачыстай абстаноўцы да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня Рэспублікі) года, у якім праводзіцца конкурс.

20. Фінансаванне расходаў на правядзенне конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ўпраўлення культуры аблвыканкама на цэнтралізаваныя культурныя мерапрыемствы.

21. Інфармацыя аб выніках конкурсу размяшчаецца ў сродках масавай інфармацыі і сетцы Інтэрнэт не пазней за 10 дзён пасля прыняцця рашэння аб вызначэнні пераможцаў конкурсу.

Дадатак
да Інструкцыі
аб парадку правядзення абласнога літаратурнага конкурсу імя М.Багдановіча

Форма

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным літаратурным конкурсе імя М.Багдановіча

| | |
|---|---|
| Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (пры наяўнасці) | |
| Дата нараджэння | |
| Адрас рэгістрацыі (фактычнага пражывання) | |
| Месца працы (вучобы), тэлефон для сувязі, адрас электроннай пошты | |
| Пасада служачага, прафесія рабочага (пры наяўнасці) | |
| Намінацыя | |
| Назва твора | |

Подпіс Прозвішча, ініцыялы